**Пётр ДАРАШЧОНАК**
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*

# НАЦЫЯНАЛЬНА-ПАЛІТЫЧНЫЯ ПРЫЯРЫТЭТЫ ГАЗЕТЫ «ОКРАИНЫ РОССИИ» І ПЫТАННІ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ Ў ТВОРЧАСЦІ ЯЕ РЭДАКТАРА І ПУБЛІЦЫСТА А. БУДЗІЛОВІЧА

Антон Сямёнавіч Будзіловіч (1846–1908 гг.) – беларускі і расійскі філолаг, гісторык, педагог і публіцыст, прыкметная асоба ў рускай славістыцы XIX –пачатку XX ст., апынуўся ў 1906 г. на вастрыні палітычных падзей, калі заняў пасаду галоўнага рэдактара газеты «Окраины России». Адстойванне, іншы раз нават даволі жорсткімі метадамі, прыярытэтаў расійскай адміністрацыі на нацыянальных ускраінах імперыі стала агульным накірункам яго актыўнай публіцыстычнай дзейнасці, якая працягвалася ў 1907–1908 гг. і на месцы рэдактара «Московских ведомостей», якое ён заняў пасля У.А. Грынгмута.

Нарадзіўся А.С. Будзілович 24 мая 1846 г. у вёсцы Коматава на Гродзеншчыне. Скончыў гісторыка-філалагічны факультэта Пецярбургскага ўніверсітэта (1866 г.), у 1878 г. абараніў дысертацыю «Первобытные славяне в их языке, быте и понятиях» і атрымаў ступень доктара славянскай філалогіі. Пасля гэтага, дзе б ён ні працаваў – прафесарам і рэктарам Варшаўскага ўніверсітэта, рэктарам Юр’еўскага ўніверсітэта (зараз г. Тарту ў Эстоніі), членам Савета міністра народнай адукацыі ці старшынёй Асобнай нарады па справах аб адукацыі іншародцаў – заўсёды праяўляў сябе як прыхільнік усяго рускага і перакананы манархіст.

Газета «Окраины России» (1906–1912 гг.) была задумана яе заснавальнікам А.М. Залатаровым у адказ на з’яўленне легальнай шматпартыйнай прэсы ў 1905 г., якая актыўна падтрымлівала нацыянальныя рухі на ўскраінах імперыі [4, с. 44]. Выданне не толькі заклікала да крытыкі нацыянальных рухаў на ўскраінах імперыі, лічачы іх праявамі сепаратызму, але і выказвала нездавальненне новымі правіламі аб друку, якія пашыралі галоснасць і правы прэсы.

На тэрыторыі ПаўночнаЗаходняга краю, дзе аспрэчвалі сваё права на лідарства афіцыйныя расійскія ўстановы і польскі (ці апалячаны) панска-шляхецкі лагер, назіраўся хуткі рост польскамоўных выданняў. У 1907 г. у Вільні выходзіла 8 польскамоўных газет і часопісаў, а праз два гады іх ужо налічвалася 18 [1, с. 21]. Газета «Окраины России», патрапіўшы ў фарватар адкрыта шавіністычнай палітыкі царызму, перайшла ў наступ на «іншародцаў» і «іншаверцаў», пакідаючы па-за

ўвагай працэсы фарміравання беларускай нацыі і пашырэння беларускага нацыянальнага руху. Невыпадкова ўсе палітычныя і культурныя працэсы ў краі разглядаліся праз прызму польскага пытання і нават многія публікацыі «Нашай Нівы» аб нацыянальным адраджэнні беларусаў расцэньваліся як чарговая «польская інтрыга». Для А. Будзіловіча і яго паплечніка прафесара М. Сяргееўскага (1849–1908 гг.) былі непрымальнымі любыя праявы сепаратызму асобных народнасцей, якія выразна праявіліся ў перыяд аслаблення дзяржаўнай улады, да таго ж ім, як і ўсім публіцыстам манархісцкага лагеру, быў уласцівы погляд на Беларусь як на «ўнутраную перыферыю Расійскай імперыі» [4, с. 45].

Ва ўмовах ідэйнага супрацьстаяння газеты і часопісы станавіліся моцным прапагандысцкім рэсурсам. Занепакоеныя абвастрэннем нацыянальных супярэчнасцей правыя сілы вялі жорсткую палеміку ў прэсе, што знаходзіла адлюстраванне нават у лексіцы газетных публікацый. Адстойваючы ўласныя нацыянальна-палітычныя прыярытэты, робячы стаўку на русіфікацыю беларуска-літоўскага краю, газета «Окраины России» пазіцыяніравала сябе ледзь не ісцінай у апошняй інстанцыі. У штыкі ўспрымалася літаральна ўсё – праблема нацыянальнай школы на старонках «Нашай Нівы», выкладанне закона Божага для каталіцкага насельніцтва на польскай мове, даследаванні гістарычнага мінулага беларускага народа. У цэлым беларускі нацыянальны рэгіён бачыўся публіцыстамі газеты не як кангламерат нацый (беларусаў, літоўцаў, палякаў, рускіх), а хутчэй як асяродак небяспечнага для адзінай манархічнай Расіі сепаратызму, дзе змагаліся польская (заходняя) і руская (усходнеславянская) цывілізацыйныя культуры.

Актыўная грамадска-палітычная дзейнасцы А. Будзіловіча саслужыла яму кепскую службу, бо ў апазіцыйных колах склаўся дастаткова змрочны яго партрэт рэакцыянера і гарачага прыхільніка панславісцкай ідэалогіі, такая ацэнка яго навуковых і грамадска-палітычных поглядаў працягвала дамінаваць і ў савецкі час. Ён, маўляў, і царскую русіфікатарскую палітыку праводзіў, і адмаўляў права на самастойнае развіццё народаў Расіі, і быў супраць выкладання ў школах дысцыплін на мовах народнасцей. Як адзначаюць сучасныя даследчыкі, «у беларускай гістарыяграфіі склаўся “чорны міф” аб непрыняцці беларускай мовы заходнерускай інтэлігенцыяй» [3, с. 110]. Варта адзначыць, што сёння навукоўцам удалося разбурыць тыя стэрэатыпы і напластаванні ранейшых дзесяцігоддзяў, якія скажалі погляды А. Будзіловіча па праблемах стварэння і функцыянавання беларускай літаратурнай мовы. Яшчэ ў 1892 г. у рабоце «Общеславянский язык в ряду других общих языков древней и новой Европы» аўтар фіксаваў

спробы літаратурнай апрацоўкі беларускіх дыялектаў, а ў будучым дапускаў магчымасць стварэння асобнай літаратурнай мовы на мясцовай дыялектнай аснове, прыдумаў нават уласны тэрмін – абласная «подлитература». У адрозненне ад Ф. Багушэвіча, які ў гэты ж гістарычны час стаў творцам сапраўднага маніфеста роднай мовы, А. Будзіловіч працягваў лічыць беларускую мову «разноречием» «великорусского наречия» [2, с. 4]. Беларуская мова, па перакананні нашага празмерна абрусеўшага земляка, павінна была застацца мовай абласной, прыватнай і не прэтэндаваць на месца і функцыі рускай літаратурнай мовы [3, с. 115]. Як паказала далейшае развіццё гістарычных падзей, сляпое захапленне манархічнымі ідэямі і безвыніковая ідэйная барацьба на старонках друку за імперскія інтарэсы на нацыянальных ускраінах Расіі не дазволіла А. Будзіловічу, нягледзячы на яго грунтоўную філалагічную падрыхтоўку, пракласці шлях да навуковага абгрунтавання самастойнасці беларускай мовы ў сям'і славянскіх моў, зробленага ў пачатку XX ст. ўжо іншай выдатнай асобай – Яўхімам Карскім у яго фундаментальнай працы «Беларусы» (1903–1922 гг.).

*Літаратура*

1. Біч, М.В. Беларускае адраджэнне ў XIX – пач. XX ст.: гістарычныя асаблівасці, узаемаадносіны з іншымі народамі / М. В. Біч. –Мн., 1992.

2. Будилович, А.С. Общеславянский язык в ряду других общих языков древней и новой Европы / А.С. Будилович. – Варшава: тип. М. Земкевич, 1892. – Т. II. – 384 с.

3. Киселев, А.А. Проблемы белорусского литературного языка в научном и публицистическом творчестве А. С. Будиловича / А.А. Киселев. – Православные ценности в современной белорусской культуре. Сб. докладов XXI Международных Кирилло-Мефодиевских чтений, посвященных 1000-летию святого равноапостольного князя Владимира, 26-27 мая 2015 г. – Минск : УП «Минар», 2016. – С. 110–116.

4. Цумарева, Е.П. Полемика в прессе по национальному вопросу в Северо-Западном крае (по страницам газеты «Окраины России» / Е.П. Цумарева // Вестник Полоцкого государственного университета. Серия А. Гуманитарные науки. Исторические науки – 2012. – № 1. – С. 44–49.